# VIVAT COR JESU

# PER COR MARIAE

## Уступ
## да літургічнай малітвы дня

Л. Пане, адкрый мае вусны
У. І вусны мае будуць абвяшчаць тваю хвалу.

Л. Пане, прыйдзі да нас з дапамогай і збаў нас, змілуйся над намі і абараняй нас, каб мы маглі годна спяваць ранішнюю песню хвалы.
У. Пане, змілуйся над намі

ЗАКЛІКІ
Найсвяцейшае Сэрца Езуса, **змілуйся над намі.**
Беззаганнае Сэрца Марыі, **маліся за нас**
Святы Юзэфе, наш апякун,
Святы арханёле Міхале,
Святы Яне, умілаваны вучань Сэрца Езуса,
Святы Аўгустыне,
Святы Францішку,
Святы Францішку Сальскі,
Святы Ігнацыю,
Святы Францішку Ксавэрыю,
Святая Гертруда,
Святая Маргарыта Марыя Алякок
Благаслаўлёны Яне Марыя ад Крыжа,
Слуга Божы айцец Леон Ян Дэон,
Усе святыя Анёлы і Арханёлы, **маліцеся за нас.**
Усе святыя і святыя Божыя, **заступіцеся за нас.**

## Акты Ахвяравання

### Урачыстасці

I

Л. Прыносьце, дзеці Божыя,
У. Прыносьце вашыя сэрцы,*каб на алтары Сэрца Езуса *Богу ў ахвяры былі складзеныя.

Л. О Сэрца Умілаванага Езуса,
У. Годнае пашаны і маёй любові. *Вось я, распалены прагненнем кампенсацыі і адплаты *за шматлікія цяжкія грахі, Табе ўчыненыя, *а таксама, каб не быць няўдзячным, *маё сэрца, усе мае пачуцці, што яго напаўняюць, *нарэшце, самога сябе цалкам Табе аддаю і прысвячаю.
О Езу, Любоў майго сэрца, *прагну складаць Твайму Сэрцу ўсялякія заслугі і цноты, *якія маюць вартасць кампенсацыі, хоць сціплыя і нязначныя,- *так мае малітвы, як і акты пакуты, пакоры, паслухмянасці, іншыя цноты, *якія ў кожны момант жыцця, аж да хвіліны сканання, выканаць змагу.
Прагну ўсё гэта чыніць, каб хваліць і любіць Сэрца Езуса, *пакорна просячы, каб не пагарджала Яно гэтым сціплым дарам, *які праз Беззаганнае Сэрца Марыі Найсвяцейшаму Сэрцу складаю, *але каб па Сваёй волі ўсім кіравала *і каму хоча заслугі прызначала. *Амэн.

II

### Наследаваць Езуса Хрыста

Л. Браты, давайце разважаць пра любоў Хрыста ў таямніцах Яго жыцця.
У. Узмоцненыя Сэрцам Езуса, злучымся з Яго ахвярай для збаўлення свету.

Л. Святы Ойча, *аб’яўляючы нам Сэрца Свайго Сына ў справе айца Дэона, *Ты паклікаў нас да паяднання з Яго збаўленчай любоўю. *Удзялі нам ласкі, *каб праз жыццё ў любові і прысвячэнні *мы далучыліся да таямніцы смерці і змёртвыхпаўстання Хрыста *і да справы кампенсацыі, якая ўсцяж здзяйсняецца ў Касцёле.*Асвяці нас у праўдзе, *учыні падобнымі да Хрыста, Які з лагоднасцю ў сэрцы служыў людзям. *Навучы нас быць сведкамі Яго любові і клопату пра кожнага чалавека, *каб мы далучыліся да будавання еднасці паміж людзьмі. *Няхай Святло Твайго Слова асвятляе нам шлях, *пакуль назаўсёды не паяднаемся з Табою. *Учыні, каб і мы, *за Яго прыкладам і дзякуючы яго ласцы, *а таксама ўзмоцненыя заступніцтвам Яго Беззаганнай Маці, *былі верныя ў абвяшчэнні Тваёй Міласэрнасці *і ў працы для набліжэння Твайго Валадарства. *Амэн.
Л. Божа Ойча, дазволь нам зразумець, што гэта Твая любоў сабрала нас у гэтай сям’і, каб мы абвяшчалі Евангелле Сэрца Езуса і былі сведкамі Тваёй Міласэрнасці. З’яднай нашае жыццё з ахвярай Твайго Сына, Які нястомна аддае Сябе за ўсіх людзей. Які жывеш і валадарыш на вякі вечныя.
У. Амэн.

Нядзеля

I

Л. Браты, наследуйце Бога
У. Як дзеці ўмілаваныя *і паступайце ў любові, *як і Хрыстус палюбіў вас *і аддаў сябе за вас як дар і ахвяру Богу на прыемны пах (пар. Эф 5, 1-2).

Л. Пане Езу Хрыстэ,
У. З любові да нас Ты выдаў Самога Сябе на крыжовую смерць.*Сёння і мы прагнем ісці шляхам Тваёй любові. *Хочам любіць Цябе і служыць Табе ў нашых братах і сёстрах,*дзякуючы ім за любоў і дабрыню, *прабачаючы іх слабасці *і молячыся аб збаўленні для іх.

Л. Пане Езу Хрыстэ, умацуй у нас перакананне, што гэта Ты паклікаў нас у Кангрэгацыю Святароў Найсвяцейшага Сэрца Езуса, каб мы былі сведкамі Тваёй любові для нашых братоў і для ўсіх тых, каго сёння сустрэнем на дарозе нашага жыцця. Прымі гэтае нашае ахвяраванне Табе і з'яднай яго з ахвярай, якую нястомна складаеш Свайму Айцу за збаўленне свету. Які жывеш і валадарыш на вякі вечныя.
У. Амэн.

II

Падабенства да Хрыста

Л. „Благаслаўлёны Бог і Айцец Пана нашага Езуса Хрыста, Які благаславіў нас у Хрысце ўсялякім духоўным благаслаўленнем на нябёсах і выбраў нас у Ім перад стварэннем свету, каб мы былі святымі і беззаганнымі перад Ім у любові" (Эф 1,4).
Просім Бога Айца, каб з'яднаў нас з ахвярай Езуса Хрыста і напоўніў гатоўнасцю і пачуццямі Яго Божага Сэрца.
У. Выслухай, Божа, нашу малітву.

- Аб вернасці ў рэалізацыі нашай законнай кансэкрацыі, каб мы напоўнілі нашае жыццё прысвячэннем і любоўю.
- Аб руплівасці ў малітве, працы, цярпеннях і поспехах сённяшняга дня, каб мы, як Хрыстус, клапаціліся пра Тваю хвалу і пра збаўленні ўсяго свету.
- Аб святле ў справах, якія пачынаем, каб мы маглі любіць Цябе і служыць Табе, прысутнаму ў нашых братах, з усёй далікатнасцю, пакорай і ахвярнасцю.
- Аб ласцы глыбокага паяднання з таямніцай смерці і змёртвыхпаўстання Хрыста, каб разам з Ім мы маглі працягваць справу кампенсацыі, якую Езус нястомна рэалізуе ў Касцёле і ў грамадстве.

Л. Святы Ойча, напоўні наш розум Тваім святлом, ствары ў нас новае сэрца, дазволь нам зразумець толькі тое і жадаць толькі таго, што падабаецца Табе, каб мы, заўсёды прабываючы ў любові Хрыста і адкрытыя на Твайго Духа, былі гатовыя праслаўляць Цябе і служыць Табе. Праз Хрыста, Пана нашага.
У. Амэн.

Панядзелак

I

Л. Браты, паступайце ў любові,
У. "Як і Хрыстус палюбіў нас, *і аддаў сябе за нас як дар *і ахвяру Богу на прыемны пах" (Эф 5,2).

Л. Пане Езу Хрыстэ,
У. Адказваючы ўзаемнасцю на ахвяру Твайго жыцця, *прагнем усё рабіць з любові, *любячы Цябе і служачы Табе, прысутнаму ў нашых бліжніх, *з якімі разам крочым да Айца. *Для іх збаўлення ахвяруем Табе нашу малітву і наш цяжар, *хочам з дабрынёй і цярплівасцю прымаць іх слабасці, *з удзячнасцю ў сэрцы хочам радавацца іх дабрыні і дапамозе. *Вось такім чынам разам з Табою прагнем скласці сябе ў ахвяру як прыемны пах Богу, *каб на хвалу Айца ўсе людзі паядналіся ў Табе. *Амэн.

Л. Дапамажы нам, Пане Езу Хрыстэ, каб мы моцна верылі, што гэта Ты паклікаў нас у гэту Кангрэгацыю, каб мы перадавалі нашым братам і ўсім, каго сустрэнем на нашым шляху, хоць частку Тваёй да іх любові. Паяднай нашу ахвяру з Тваёй ахвярай, якую нястомна складаеш Айцу за людзей.
У. Амэн.

II

Ахвяраванне нашых спраў, якія пачынаем

Л. „І ўсё, што б вы ні рабілі словам ці ўчынкам, усё рабіце ў імя Пана Езуса, дзякуючы праз Яго Богу Айцу" (Кал 3,17).
Давайце ахвяруем Богу нашае жыццё, яднаючы яго з ахвярай Хрыста, складзенай на хвалу Айца, а таксама для збаўлення ўсяго свету.

У. Прымі, Пане, нашу ахвяру!

- Ахвяруем Табе, о Пане, працу, радасці і цярпенні сённяшняга дня.
- Ахвяруем Табе, о Пане, нашу гатоўнасць дапамагаць усім, хто чакае ад нас сведчання братняй любові.
- Ахвяруем Табе, о Пане, нашу гатоўнасць выканаць Тваю волю, аб'яўленую ў навучанні Касцёла, у знаках часу і ў жыццёвых абставінах.
- Ахвяруем Табе, о Пане, кожнае нашае намаганне і нашу пакорную гатоўнасць супрацоўнічаць, каб мы сталі сапраўднымі апосталамі Твайго Евангелля і Тваёй любові, прыкладамі справядлівасці ў сэрцах і ў грамадстве.

Л. Пане Езу Хрыстэ, Ты паклікаў нас, каб жыццём і словам мы сведчылі пра Тваю вялікую любоў. Просім Цябе, учыні, каб сярод нашых абавязкаў мы, уважлівыя да Твайго слова, былі гатовыя прыняць і выканаць Тваю волю на хвалу Айца, для збаўлення нашага і ўсяго свету. Які жывеш і валадарыш на вякі вечныя.
У. Амэн.

Аўторак

I

Л. Пакліканыя да штодзённага ўдзелу ў Эўхарыстыі,
У. Яднаемся, праз духоўную ахвяру нашага жыцця, *з дасканалай Ахвярай, Якую Божы Сын складае Свайму Айцу (пар. Канст. 81).

Л. Праслаўляем Цябе, Пане Божа,
У. За тое, што ў таямніцы прабітага боку Езуса Хрыста *аб’явіў нам бязмежнае багацце любові Божага Сына, *Які нас асвяціў і адкупіў праз Сваё ўцелаўленне, смерць і ўваскрасенне. *Учыні, каб мы заўсёды выконвалі Тваю святую волю *і былі адкрытыя на дзеянне ў нас Святога Духа. *Амэн.

Л. Божа, Ойча Усемагутны, Які паклікаў нас да жыцця і святасці, а ў Сэрцы Свайго Сына аб’явіў глыбіню Сваёй любові, схілі нашыя сэрцы да выканання Тваёй волі, каб мы навучыліся складаць усё нашае жыццё ў няспыннай ахвяры на Тваю хвалу. Праз Хрыста, Пана нашага.
У. Амэн.

II

Ахвяраванне нашага братэрства

Л. „Па гэтым пазналі мы любоў, што Ён аддаў за нас сваё жыццё. І мы павінны аддаць жыццё сваё за братоў” (1 Ян 3,16).
Далучымся да збаўленчай ахвяры Хрыста, каб аднавіць нашае жыццё ў любові.

У. Мы гатовыя, Пане!

- Разам з Табою стаць пакорнымі слугамі еднасці і супакою ў Касцёле і ў грамадстве.
- Працягваць Тваю прысутнасць, пазначаную любоўю, міласэрнасцю і дапамогай для самых слабых, бедных, церпячых і грэшнікаў.
- У еднасці з Табою ахвяраваць нашае жыццё братам праз жывое сведчанне прысвячэння і братэрскага служэння.
- Разам з тымі, з кім з’яднаныя ў малітве, у жыцці і ў працы, гатовыя сёння служыць радасна і па- братэрску.

Л. Пане Езу Хрыстэ, дзякуем Табе за тое, што ў Сваёй дабрыні з’яднаў нас у гэтым святым служэнні. Удзялі нам Сваю ласку і ўчыні, каб нашае жыццё станавілася ўсё большым сведчаннем сапраўднага братэрства. Які жывеш і валадарыш на вякі вечныя.
У. Амэн.

Серада

I

Л. Браты, Хрыстус прыходзіць у свет і кажа:
У. ”Ахвяры і прынашэння Ты не захацеў, *але цела падрыхтаваў Мне. *Усеспаленні і ахвяры за грэх не даспадобы Табе. *Тады Я сказаў: *Вось іду, як у пачатку кнігі напісана пра Мяне, каб выканаць волю Тваю, Божа” (Гбр. 10,5-7).

Л. Пане Езу Хрыстэ,
У. Разам з Табою хочам сёння выконваць волю Айца, *дзе б яна ні аб’явілася: *у недахопах і нястачах бліжняга, *у яго слабасці, якая заклікае нас да спагадлівасці, *у яго дабрыні, якая абуджае ў нас удзячнасць, *у просьбе бліжняга ратаваць яго цела і душу, *у нашай працы і цярпеннях. *Езу Хрыстэ, яднаемся з Тваёй ахвярай кампенсацыі і верым у тое, *што воля Айца хоча нашага збаўлення *і нашага супрацоўніцтва для збаўлення іншых. *Амэн.

Л. Пане Езу Хрыстэ, ахвяруем Табе саміх сябе, каб сёння разам з Табой на кожны заклік Айца мы былі гатовыя выконваць тое, чаго толькі ад нас пажадае, прымаць усё, што на нас ні спашле: як радасці, так і цярпенні. Злучы з Сабой і з полымем Тваёй ахвярнай любові гэтую нашую ахвяру, якая выплывае з любові, каб споўнілася воля Айца, як у небе, так і на зямлі, і каб усё чалавецтва аднавілася ў Табе.
У. Амэн.

II

Дар нашага законнага і святарскага жыцця

Л. “Прыступаючы да Яго, жывога каменя, адкінутага людзьмі, але выбранага Богам, каштоўнага, і вы самі, як жывыя камяні, будуйцеся ў дом духоўны, святарства святое, каб прыносіць духоўныя ахвяры, прыемныя Богу, праз Езуса Хрыста”(1 П 2,4-5).
Просім Айца аб ласцы, каб моцай Яго Духа мы станавіліся падобныя да Хрыста - Святара і Ахвяры:
У. Ажыўляй у нас, Пане, дары Твайго Духа.

- О Пане, з пакорай, цалкам, аддаёмся Тваёй волі, каб моц Тваёй любові па-сапраўднаму аднавіла жыццё ў нас, ва ўсім Касцёле і паміж людзьмі.
- О Пане, ахвяруем Табе сёння нашае служэнне яднання людзей у любові і супакоі.
- О Пане, Ты заклікаеш нас да наследавання Хрыста, Святара і Ахвяры, няхай споўніцца не наша воля, але Твая воля - сёння і назаўсёды.
- О Пане, аддаём Табе нашае жыццё ў беднасці, чыстасці і паслухмянасці, каб Хрыстус мог жыць у кожным з нас і каб нашыя ўчынкі былі Яго ўчынкамі.

Л. Ойча, прымі нашую волю служыць Табе, паяднаную з любоўю Хрыста да Цябе і да нашых братоў; учыні нас адкрытымі на знакі Тваёй волі, паслухмянымі дзеянню Твайго Духуа, каб нішто не адлучыла нас ад Сэрца Хрыста і каб з матчынай дапамогай Панны Марыі мы навучыліся любіць па-сапраўднаму. Праз Хрыста, Пана нашага.
У. Амэн

Чацвер

I

Л. Браты, давайце дзякаваць нашаму Пану Езусу Хрысту
У. За тое, што даў нам удзел у Сваім вечным святарстве, *каб мы маглі супрацоўнічаць у Яго справе збаўлення свету.

Л. Пане Езу Хрыстэ,
У. Найвышэйшы і Вечны Святар, *спашлі нам Свайго Духа: *Духа мудрасці і розуму, *Духа парады і мужнасці, *Духа ўмеласці і пабожнасці, а таксама Духа боязі Божай. *Адары нас духам Свайго святарства, *каб мы з Табой і ў Табе бралі ўдзел у асвячэнні і аднаўленні свету. *Дай нам сэрца новае, падобнае да Твайго Сэрца, *ахвярнае ў справе абвяшчэння Твайго Евангелля і Тваёй любові. *Амэн.

Л. Пане Езу Хрыстэ, адары нас сапраўднай любоўю да ўсіх людзей, нашых братоў, за якіх Ты цярпеў і аддаў Сваё жыццё. Навучы нас жыць згодна з той навукай, якую абвяшчаем іншым. Аддаём Табе ўсё нашае жыццё і ўвесь гэты новы дзень, прымаючы ўсё, што нам сёння спашлеш: як радасці так і цярпенні, якія ёсць знакам Тваёй любові да нас.
У. Амэн.

II

Воля Айца

Л. „Хрыстус прыходзіць у свет і кажа: “Ахвяры і прынашэння Ты не захацеў, але цела падрыхтаваў Мне. Усеспаленні і ахвяры за грэх не даспадобы Табе. Тады Я сказаў: Вось іду, як у пачатку кнігі напісана пра Мяне, каб выканаць волю Тваю, Божа” (Гбр. 10,5-7).
У еднасці з Хрыстом прагнем, як і Ён, выконваць волю Айца, дзе б яна ні аб’явілася:

У. Мы гатовыя выконваць Тваю волю!

- У выкліках супрацоўнічаць і сведчыць, каб у грамадстве пашыралася валадарства справядлівасці, любові і супакою.
- У запрашэнні любіць, разумець і дапамагаць кожнаму, хто церпіць цялесна і духоўна.
- У штодзённых абавязках нашай супольнасці, якія праяўляюцца ў малітве і ў працы.
- У запрашэнні прысвяціць сябе і напоўніць Тваёй любоўю ўсё сваё жыццё.

Л. Пане Езу, аддаём Табе саміх сябе, каб быць разам з Табой, прымаць ад Нябеснага Айца ўсё, што на нас ні спашле, выконваць усё, чаго ад нас чакае, далучы да полымя Тваёй любові і нашу ахвяру, каб воля Айца споўнілася як у небе, так і на зямлі, а ўсё чалавецтва аднавілася ў Табе. Які жывеш і валадарыш на вякі вечныя.
У. Амэн.

Пятніца

I

Л. Браты, разам са святым Янам

У. “У прабітым баку Укрыжаванага бачым знак любові, *якая праз поўны дар з самой сябе *нанова стварае чалавека на ўзор Бога” (Канст.21).

Л. Пане Езу, Ты назваў нас сваімі сябрамі,

У. Цалкам аддаём Табе саміх сябе, *каб жыць у Тваёй любові *і трываць у любові Айца. Ты выбраў нас, *каб мы, жывучы духам ахвяры, *сталі сведкамі святасці Касцёла *і апосталамі Твайго Найсвяцейшага Сэрца. *Сёння ізноў прыходзім да Цябе, *каб з Твайго прабітага Сэрца атрымаць ласку прабачэння грахоў *і дар Духа Святога, *Які чыніць нас святарамі, аддынымі на Хвалу Айца. *Амэн.

Л. Пане Езу, Спрадвечны Святар, прысутны ў Найсвяцейшым Сакраманце Твайго Цела і Крыві, прымі нашу ахвяру, у якой складаем Табе саміх сябе як кампенсацыю за нашыя грахі. Умацуй нас у Тваёй любові і прадстаў Твайму Айцу як умілаваных сыноў. Які жывеш і валадарыш праз усе вякі вечныя.

У. Амэн.

II

Шлях любові

Л. “…наследуйце Бога, як дзеці ўмілаваныя, і паступайце ў любові, як і Хрыстус палюбіў нас, і аддаў сябе за нас як дар і ахвяру Богу на прыемны пах” (Эф 5,1-2).

Каб адказаць на ахвяру, якую Хрыстус складае са Свайго жыцця, усклікаем:

У. Учыні нас, Пане, слугамі Тваёй любові!

- Яднаючыся з Тваёй ахвярай, якую складаем, каб прывесці ўсіх людзей да братэрства з Табой, усклікаем ...
- Вучачыся лагоднасці, прабачэнню і пакоры Твайго Сэрца ў адносінах да слабых, бедных і церпячых, усклікаем ...
- У малітве, працы і ў клопаце пра набліжэнне Твайго Валадарства, усклікаем ...
- З радасцю і ўдзячнасцю за дабрыню і за ўсе дары, атрыманыя ад нашых братоў, усклікаем ...

Л. Пане Езу, дапамажы нам упэўніцца, што гэта Твая любоў сабрала нас у гэтай супольнасці, каб мы неслі Тваю любоў нашым братам і ўсім тым, каго сустрэнем на нашым шляху; далучы нашу ахвяру да той, якую складаеш Айцу за ўсіх людзей. Які жывеш і валадарыш праз усе вякі вечныя.

У. Амэн.

Субота

I

Л. “Прашу вас, браты, праз літасць Божую:
У. Аддайце целы вашыя на ахвяру жывую, святую, прыемную Богу як выраз вашага разумнага служэння” (Рым. 12,1).

Л. Пане Езу Хрыстэ,
У. Ты запрасіў нас да ўдзелу ў Эўхарыстыі, *дзе даеш нам Сваё Цела. *Сёння і мы хочам аддаць саміх сябе, каб на хвалу Айца служыць братам: *праз малітву нашых вуснаў і жэстаў, *праз нашу фізічную працу і нашыя словы, *праз нашыя слых і зрок, *праз нашыя намаганні і нашыя цярпенні. *Згодна з нашымі магчымасцямі *хочам далучыцца да збаўлення нашых братоў на хвалу Айца. *Амэн.

Л. Прымі, Пане Езу, гэтую нашую ахвяру: нашу працу, нашыя радасці і цярпенні. Навучы нас адданасці Табе ва ўсім. Учыні, каб мы былі гатовыя абвяшчаць людзям Тваю міласэрнасць і рыхтаваць іх да набліжэння Твайго Валадарства.
У. Амэн.

II

Дар нашага цела

Л. “Прашу вас, браты, праз літасць Божую: аддайце целы вашыя на ахвяру жывую, святую, прыемную Богу як выраз вашага разумнага служэння” (Рым. 12,1).
Запрошаныя да ўдзелу ў дары, які Хрыстус складае са свайго Цела ў Эўхарыстыі, усклікаем з любоўю:

У. Азвяруем Табе, Пане!

- Гатоўнасць служыць сёння братам, аддаючы ім нашыя сілы на хвалу Бога Айца.
- Хвалу, якую аддаём Табе праз малітву, праз наш стыль жыцця, праз намаганні ў працы і ў апостальстве.
- Цярплівасць у слуханні і шчыры дыялог з тымі, хто патрабуе суцяшэння, разумення і прабачэння.
- Гатоўнасць да вернага выканання Тваёй волі, аб’яўленай у Тваім слове, у навучанні Касцёла і ў штодзённай вернасці законным шлюбам.

Л. Пане Езу, прымі ахвяру нашага цела, нашу працу, нашыя радасці і цярпенні сённяшняга дня, навучы нас, каб мы заўсёды і ўсюды былі гатовыя абвяшчаць свету Тваю міласэрнасць і працаваць для набліжэння Твайго Валадарства. Які жывеш і валадарыш праз усе вякі вечныя.
У.Амэн.

## Малітва аб святарскіх і манаскіх пакліканнях

Пане Езу Хрыстэ, Збаўца свету, *пакорна Цябе просім праз Тваё Найсвяцейшае Сэрца *і праз Беззаганнае Сэрца Маці Тваёй Марыі: *не пакідай Сваю аўчарню, Пастыр Вечны, *але ўзбудзі ў святым Касцёле таго Духа, *Якога калісьці так шчодра спаслаў на Сваіх Апосталаў. *Пакліч, просім, як найбольш маладых людзей да святарскага і манаскага жыцця. *Тых, каго выбераш і паклічаш, *заўсёды няхай ажыўляе руплівасць пра Тваю хвалу і пра збаўленне душаў, *няхай асвячае іх ласка і цнота, *а Дух Твой няхай узмацняе іх ва ўсіх выпрабаваннях. *Езу, дай нам святароў і кансэкраваных асобаў паводле Твайго Сэрца. *Амэн.

## О Пані мая

О Пані мая, Святая Марыя, *Тваёй ласцы, асаблівай апецы *і вялікай Тваёй міласэрнасці *сёння і кожны дзень, а таксама ў хвіліну маёй смерці *аддаю душу маю і цела маё, *усю надзею маю і суцяшэнне маё, *усе прыніжэнні і слабасці мае, *жыццё і канец жыцця майго давяраю Табе, *каб праз Тваё найсвяцейшае заступніцтва і праз Твае заслугі *ўсе мае справы я ўладкаваў і выканаў згодна з Тваёй і Сына Твайго воляй. *Амэн.

## Малітва да святога Міхала Арханёла

Святы Арханёле Міхале, беражы нас у змаганні, *будзь нам абаронаю супраць спакусаў і пастак злога духа, *пакорна просім, няхай яго знішчыць Пан Бог, *а Ты, Князю войска нябеснага, магутнасцю Божай скінь у пекла сатану і іншы злых духаў, *якія на згубу душаў людскіх снуюць па свеце. *Амэн.

## Малітва аб беатыфікацыі айца Леона Яна Дэона

Дзякуем Табе, Пане, Ойча наш.
Ты захацеў узбагаціць Касцёл новай законнай сям’ёй,
Якую паклікаў да існавання Твой слуга Леон Ян Дэон.
Беатыфікацыя гэтага Твайго слугі, калі адбудзецца, будзе, несумненна, на большую Тваю чэсць і хвалу.
Учыні, каб, як і ён, мы станавіліся прарокамі любові і слугамі навяртання ў Сэрцы Твайго Адзінароднага Сына.
Няхай за прыкладам яго жыцця ідуць святыя вучні, якія нясуць святло і радасць Твайго Евангелля.
Няхай нашае жыццё, Ойча, з’яднанае з Езусам Хрыстом, нашым Панам, асвечанае Святым Духам
будзе мілай Табе ахвярай на збаўленне свету.
Амэн.

## Запавет любові

Мой Езу, перад Табой і перад Тваім Нябесным Айцом, у прысутнасці Беззаганнай Марыі, маёй Маці, і майго апекуна, святога Юзафа, шлюбую прысвяціць сябе з чыстай любові Найсвяцейшаму Сэрцу Твайму, аддаць маё жыццё і ўсе сілы справе святароў Твайго Сэрца, прымаючы ўсе выпрабаванні і ўсе ахвяры, якіх ад мяне пажадаеш.
Абяцаю, што ўсё буду чыніць у інтэнцыі чыстай любові да Езуса і да Яго Найсвяцейшага Сэрца. Мой Езу, прашу Цябе, дакраніся да майго сэрца, распалі яго Сваёй Любоўю, каб я не толькі быў ажыўлены інтэнцыяй і прагненнем любіць Цябе, але больш таго, каб дзякуючы Тваёй святой ласцы маё сэрца было шчаслівым толькі ў Табе.

*Айцец Ян Леон Дэон*

Акт кампенсацыі Найсвяцейшаму Сэрцу Пана Езуса

Л. Гэта тое Сэрца,

У. Якое так моцна палюбіла людзей.*Сапраўды, о Пане, *Твая любоў паклікала нас да ласкі і жыцця, *а пасля ўпадку падрыхтавала нам абяцанае адкупленне. *Твая Любоў, распачынаючы ахвяру кампенсацыі, *выбрала прыніжэнне ўцелаўлення і нараджэння. *Тваё Дзіцячае Сэрца *праз слодыч сваю, *пакору і першыя ўсеспаленні *прагнула нашай узаемнай любові. *У цяжкасцях і выпрабаваннях палала Тваё Сэрца любоўю. *Палала ёй таксама, *калі Ты, кіраваны любоўю *а прыгнечаны цяжарам нашых правінаў, *у час канання ў садзе Аліўным праліваў крывавы пот. *Тваё Сэрца жадала, *учыніўшы на крыжы сваю ахвяру, *у канцы быць дзідай адкрытым.

Тваё Сэрца ўстанавіла сакрамант любові, *каб, няспынна нам аддаючыся, *зняволіць нас да Сваёй любові. *Урэшце, Тваё Сэрца падрыхтавала нам трон у небе.

**Гэта Сэрца**, *Якое так моцна палюбіла людзей, *а Якое атрымлівае ад многіх, *нават ад гэтых асабліва ўмілаваных, *толькі холад, абыякавасць і няўдзячнасць.

Мы чулі, о Пане, Твае напоўненыя болем скаргі. *Благаслаўлёнай слузе і вучаніцы Твайго Сэрца Ты адкрыў, *што гэтая няўдзячнасць найбольш балючая для Цябе, чым цярпенні ўсёй Тваёй мукі. *Ты сказаў, *што, калі б людзі аказалі Табе хоць крыху любові, *за нішто палічыў бы ўсё тое, што для іх учыніў.

Гэтай узаемнай любоўю хочам адорваць Цябе, о Пане. *Мы можам суцешыць Цябе нашай любоўю, поўнай спачування і ўдзячнасці. *Каб мы маглі жыць толькі жыццём, поўным прысвячэння, самаадрачэння і любові, *якой так прагне Тваё Сэрца!

Разам з Марыяй Магдаленай *хочам выліць на галаву Тваю святую і ногі Твае *пах сардэчнай любові і вернай хвалы. *З Веранікай прагнем суцешыць Цябе за ўсе знявагі, якімі Ты напоены.

Нарэшце, з Маці Тваёй, *са святым Янам і з адданымі і вернымі сябрамі на Кальварыі *хочам кампенсаваць Табе самотнасць, *у якой пакінулі Цябе так шмат ўмілаваных сэрцаў.

Каб праз нашу апостальскую стараннасць *мы маглі ўсе сэрцы прывесці да Цябе.

Усюды няхай любяць Найсвяцейшае Сэрца Езуса!

Сэрцу Езуса, праслаўлення годнаму, *няхай будзе хвала, падзяка і суцяшэнне ўсюды і заўсёды. *Амэн.